# § 40. Структура сферы паслуг. Геаграфія гандлю і дзелавых паслуг

***Успомніце.*** *Чаму, акрамя сферы вытворчасці, у свеце ўзнікла і сфера паслуг? Якімі паслугамі вы карыстаецеся ў паўсядзённым жыцці?*

**1. Структура сферы паслуг.** На этапе пераходу да постындустрыяльнага этапу развіцця ў эканоміцы павялічваецца роля сферы паслуг, якая забяспечвае ўмовы жыццядзейнасці грамадства, павышэнне ўзроўню жыцця людзей. Яна характарызуецца складанай структурай, дзе прадстаўлена вялікая колькасць відаў эканамічнай дзейнасці. У эканамічнай геаграфіі шмат падыходаў да падзелу сферы паслуг. Умоўна іх можна падзяліць на тры групы: гандаль, дзелавыя і бытавыя паслугі; навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі; паслугі транспарту (мал. 134). Кожны з блокаў мае разгалінаваную структуру і развіваецца высокімі тэмпамі.

Важную ролю ў сферы паслуг традыцыйна адыгрываюць размеркавальныя паслугі — транспарт і гандаль. У цяперашні час яны істотна змяніліся: пераўтвораны структуры перавозак, створаны лагістычныя цэнтры, арганізаваны сеткавы гандаль і г. д. У эпоху НТР у сусветнай гаспадарцы з'яўляюцца якасна новыя віды паслуг: інфармацыйна-камунікацыйныя, навукова-даследчыя, банкаўскія і фінансавыя, турысцкія і інш. У Беларусі актыўна ўкараняюцца сучасныя касмічныя тэхналогіі.

**Сфера паслуг**

| Гандаль, дзелавыя і бытавыя паслугі | Навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі | Паслугі транспарту |
|---|---|---|
| – Гандаль<br>– Сувязь<br>– Выдавецкая дзейнасць<br>– Інфармацыя і тэлекамунікацыі<br>– Фінансавыя і страхавыя паслугі<br>– Бытавое абслугоўванне<br>– Паслугі па часовым пражыванні і харчаванні<br>– Іншыя паслугі | – Адукацыя<br>– Навуковая дзейнасць<br>– Ахова здароўя<br>– Культура і творчасць<br>– Спорт<br>– Турызм<br>– Іншыя паслугі | – Транспартная дзейнасць<br>– Складзіраванне і дапаможная дзейнасць |

Мал. 134. Структура сферы паслуг

У Беларусі актыўна ўкараняюцца сучасныя касмічныя тэхналогіі. Сёння наша краіна можа выраблять спадарожнікі дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі на ўзроўні найлепшых сусветных узораў. Дзякуючы гэтаму Рэспубліка Беларусь увайшла ў лік касмічных дзяржаў. У 2024 г. Васілеўская Марына Вітальеўна прыняла ўдзел у палёце да Міжнароднай касмічнай станцыі і стала першым у гісторыі суверэннай Беларусі касманаўтам. Васілеўская Марына Вітальеўна ўганаравана званнем «Герой Беларусі».

**2. Роля сферы паслуг у эканоміцы Беларусі.** Галоўным спажыўцом паслуг выступае насельніцтва, таму геаграфія ўстаноў сферы паслуг залежыць ад асаблівасцей яго размяшчэння. Многія віды паслуг з'явіліся ў выніку развіцця сферы вытворчасці. Асаблівы ўплыў яна зрабіла на такія віды паслуг, як транспарт і гандаль. У сваю чаргу сфера паслуг уплывае на развіццё прамысловага комплексу. Узровень развіцця сферы паслуг з'яўляецца паказчыкам эканамічнага развіцця краіны. Так, у развітых краінах у сферы паслуг занята большая колькасць жыхароў, чым у сферы вытворчасці. У Беларусі сферай паслуг ахоплена больш за 60 % насельніцтва, занятага ў эканоміцы. Удзельная вага сферы паслуг у структуры ВУП у апошнія гады павялічваецца: у 2024 г. яна склала 49,7 %.

Сфера паслуг лепш развітая ў буйных гарадах Беларусі, аднак усё шырэй укараняецца ў невялікіх гарадах і сельскіх паселішчах.

Паслугі насельніцтву адрозніваюцца па перыядычнасці іх аказання. Сетка прадпрыемстваў і ўстаноў паўсядзённага попыту больш развітая і шчыльная. У яе ўваходзяць аб'екты рознічнага гандлю, установы адукацыі і аховы здароўя, прадпрыемствы грамадскага харчавання і інш. Сетка ўстаноў перыядычнага попыту (бібліятэкі, тэатры, музеі, атэлье, рамонтныя майстэрні і г. д.) больш рэдкая. Назавіце аб'екты і ўстановы паўсядзённага і перыядычнага попыту, якія ёсць у вашым населеным пункце.

Для паляпшэння якасці паслуг і іх даступнасці ў краіне распрацаваны сацыяльныя стандарты. У структуры відаў эканамічнай дзейнасці вялікая ўдзельная вага гандлю, транспарту, інфармацыі і сувязі.

**3. Гандаль.** Адзін з найстарэйшых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг, які інтэнсіўна развіваецца ў Беларусі. Гандаль — сувязное звяно паміж спажыўцом і вытворцам. У сферы паслуг удзельная вага гандлю ў ВУП Беларусі самая высокая і складае 9,7 %.

Гандаль падзяляецца на аптовы і рознічны. Аптовы гандаль ажыццяўляе закупку вялікіх партый тавараў для далейшай іх рэалізацыі праз прадпрыемствы рознічнага гандлю. У Беларусі больш за 15 тыс. арганізацый аптовага гандлю, для якіх створана адпаведная інфраструктура. Функцыянуе больш за 9 тыс. спецыялізаваных складскіх памяшканняў.

Рознічны гандаль набліжаны да месцаў пражывання людзей і мае разгалінаваную сетку. Для размяшчэння аб'ектаў рознічнага гандлю важная крокавая даступнасць. Іх колькасць у 2022 г. перавысіла 72 тыс. Да тыпаў рознічных гандлёвых аб'ектаў адносяцца крамы, гандлёвыя цэнтры, палаткі і кіёскі, рынкі, перасоўныя сродкі развазнога гандлю, аўтазаправачныя станцыі. Сярод іх пераважаюць крамы. У апошнія гады павялічваецца колькасць гіпермаркетаў і супермаркетаў, гандлёвых цэнтраў, якія паступова выцясняюць рынкі.

У 2023 г. у Мінску адкрыты гандлёвы цэнтр «Першы Нацыянальны гандлёвы дом». Гэта першы гандлёвы праект, у якім прадстаўлена прадукцыя найлепшых айчынных вытворцаў — брэндаў г. Мінска і ўсіх абласцей краіны (мал. 135).



Мал. 135. Першы Нацыянальны гандлёвы дом

У Беларусі хуткімі тэмпамі развіваецца сеткавы гандаль. Функцыянуюць такія гандлёвыя сеткі, як «Еўраопт», «Гіпа», «Мацярык», «Міла» і інш. Яны, як правіла, канцэнтруюцца ў буйных гарадах з большай пакупніцкай здольнасцю. Але ў апошнія гады сеткавы гандаль ахоплівае і сельскую мясцовасць.

У гандаль усё шырэй укараняюцца сучасныя тэхналогіі. Хуткімі тэмпамі пашыраецца сетка інтэрнэт-крам. Вялікія аб'ёмы продажаў у такіх анлайн-пляцовак, як «Едастаўка», «21vek.by», «Wildberries» і інш. Крамы ўкараняюць сістэму зніжак, розныя рэкламныя акцыі, сістэму дастаўкі тавараў і г. д.

**4. Інфармацыя і сувязь.** Найбольш высокімі тэмпамі ў сферы паслуг развіваюцца інфармацыя і сувязь, або інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ). Гэта від эканамічнай дзейнасці па стварэнні і распаўсюджанні інфармацыйных матэрыялаў, ажыццяўленні тэлекамунікацый, прымяненні інфармацыйных тэхналогій і інфармацыйным абслугоўванні. На долю ІКТ прыпадае каля 5 % ВУП.

Чаму ІКТ — гэта адзін з відаў паслуг, якія найбольш хутка развіваюцца?

Па шэрагу паказчыкаў распрацоўкі і выкарыстання ІКТ Беларусь займае вядучыя пазіцыі ў свеце: 10-е месца па экспарце ІКТ-паслуг, 27-е месца па выкарыстанні ІКТ, 48-е месца па доступе да ІКТ.

У Мінску паспяхова функцыянуе Парк высокіх тэхналогій (ПВТ), які займаецца вырашэннем пытанняў інфармацыйнага абслугоўвання насельніцтва.

ПВТ — адзін з найбуйнейшых кластараў інфармацыйных тэхналогій у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Яго рэзідэнтамі з'яўляюцца больш за 1030 дзейных кампаній, сярод якіх EPAM Systems, Viber Media, «Гейм Стрым» і інш. У сферу дзейнасці рэзідэнтаў ПВТ уваходзяць распрацоўкі высакакласнага праграмнага забеспячэння, гульняў і мабільных дадаткаў, банкаўскага праграмнага забеспячэння, распрацоўкі ў галіне штучнага інтэлекту, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, лазерных тэхналогій, оптыкі. Значная колькасць праграмнага забеспячэння ПВТ пастаўляецца за мяжу.

На беларускім рынку ІКТ-паслуг лідзіруе «Белтэлекам». Усю тэрыторыю Беларусі (больш за 99 %) ахоплівае мабільная сувязь аператараў МТС, А1, Life:). Паслугамі доступу да інтэрнэту карыстаюцца амаль 89,5 % насельніцтва краіны. Пры гэтым сярод гарадскіх жыхароў доля інтэрнэт-карыстальнікаў — 90 %, сярод сельскіх — 80 %. Мабільная сувязь, інтэрнэт актыўна ўкараняюцца таксама ў сферу вытворчасці.

Штодня ў інтэрнэт выходзяць 87,9 % карыстальнікаў. Найбольш актыўныя маладыя людзі ва ўзросце 16–24 гадоў (96 %). Доля карыстальнікаў сярод асоб ва ўзросце 55–64 гадоў — 85 %, 65–72 гадоў — 65 %. Найбольш папулярнай мэтай выкарыстання інтэрнэту з'яўляецца пошук інфармацыі, прагляд фільмаў, праслухоўванне музыкі, камп'ютарныя гульні, спампоўванне інфармацыі, зносіны ў сацыяльных сетках. Чаму ў наш час узрасла роля інфармацыйнай бяспекі?

Імклівае развіццё ІКТ дазволіла ажыццявіць пераход тэлевізійнага вяшчання на лічбавы фармат.

У Беларусі рэалізуецца дзяржаўная праграма «Лічбавае развіццё Беларусі». Адзін з асноўных кірункаў лічбавага развіцця Беларусі — рэгіянальнае лічбавае развіццё. Рэалізацыя праекта «Разумныя гарады Беларусі» дазволіць стварыць рэгіянальную лічбавую платформу і ўкараніць яе ў 17 гарадах (рэгіёнах): г. Мінску, абласных цэнтрах, Баранавічах, Пінску, Навапалацку, Оршы, Полацку, Мазыры, Лідзе, Барысаве, Салігорску, Маладзечне, Бабруйску. Што такое разумны горад?

**5. Фінансавая дзейнасць і страхаванне.** У эпоху глабалізацыі важным відам эканамічнай дзейнасці становіцца фінансавая дзейнасць. Гэта від эканамічнай дзейнасці, звязаны з атрыманнем і пераразмеркаваннем фінансавых сродкаў, неабходных для вырашэння гаспадарчых і сацыяльных задач.

У краіне з'явілася вялікая колькасць холдынгавых і traставых кампаній, інвестыцыйных фондаў і іншых арганізацый, якія аказваюць фінансавыя паслугі. На мяжы XX–XXI стст. у краіне ўтварыліся банкі.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь — цэнтральны банк і дзяржаўны орган краіны, які забяспечвае стабільнасць банкаўскай сістэмы, эфектыўнае, надзейнае і бяспечнае функцыянаванне плацежнай сістэмы.

На тэрыторыі Беларусі дзейнічае больш за 20 банкаў і крэдытна-фінансавых арганізацый, якія маюць права на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый. Найбуйнейшыя сярод іх — «Беларусбанк», «Белаграпрамбанк», «Сбер Банк» і інш.



Мал. 136. «Банк БелВЭБ», г. Мінск

Банкі даюць крэдыты для розных эканамічных і сацыяльных праектаў. У апошнія гады расце інвестыцыйная прывабнасць Рэспублікі Беларусь, павялічваецца колькасць банкаў з удзелам замежнага капіталу. Лідзіруюць сярод іх «Прыорбанк», «Банк БелВЭБ» (мал. 136).

Істотна пашырыўся асартымент такіх паслуг, як страхаванне маёмасці, будынкаў, медыцынскае страхаванне, страхаванне транспартных сродкаў і г. д. На рынку страхавых паслуг лідзіруючыя пазіцыі займае «Белдзяржстрах».

**Падвядзём вынікі.** У цяперашні час сфера паслуг развіваецца больш высокімі тэмпамі. Вядучыя віды эканамічнай дзейнасці сферы: гандаль, транспарт, інфармацыя і сувязь. Да відаў, якія найбольш хутка развіваюцца, адносяцца інфармацыя і сувязь.

***Праверце сябе.*** 1. Па якім прынцыпе вылучаецца структура сферы паслуг? 2. Якія прадпрыемствы і ўстановы сферы паслуг Беларусі адносяцца да катэгорыі паўсядзённага попыту, а якія — перыядычнага? 3. Чаму гандаль мае высокую ўдзельную вагу ў ВУП краіны? 4. Чаму такімі хуткімі тэмпамі развіваюцца ІКТ?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Па карце атласа (с. 61) вызначце асаблівасці фінансавай дзейнасці вашага рэгіёна. 2. Чым тлумачацца структурныя змены сферы паслуг? 3. Якія новыя віды эканамічнай дзейнасці сферы паслуг узнікаюць у цяперашні час і якія могуць узнікнуць у бліжэйшы?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Падрыхтуйце паведамленне «Як змяніліся гандаль, фінансавая дзейнасць і страхаванне пры актыўным развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».

## § 41. Геаграфія навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг

***Успомніце.*** *Якія ступені адукацыі вы ўжо прайшлі і якія плануеце пераадолець? Якія ўстановы культуры вы наведвалі?*

**1. Адукацыя і навуковая дзейнасць.** Беларусь мае развітую сістэму адукацыі. Установы адукацыі размешчаны раўнамерна па ўсёй краіне. Сістэма адукацыі ўключае ўстановы, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы рознага ўзроўню (мал. 137).

Узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва, паводле перапісу насельніцтва 2019 г., складае 99,9 %, ахоп адукацыяй занятага насельніцтва — 97,8 %. Па паказчыку «Доступ да базавых ведаў» у Індэксе сацыяльнага прагрэсу Беларусь на 2025 г. займае 22-е месца сярод 170 краін свету.

У Беларусі добра развітая сістэма дашкольнай адукацыі. Да ўстаноў дашкольнай адукацыі адносяцца дзіцячыя сады, санаторныя дзіцячыя сады, дашкольныя цэнтры развіцця дзіцяці. Іх наведваюць больш за 89 % дзяцей дашкольнага ўзросту. У Беларусі каля 3700 устаноў дашкольнай адукацыі, якія наведваюць больш за 355 тыс. чалавек. Найбольшы ахоп дзяцей такімі ўстановамі ў Мінску.

Лідзіруюць па колькасці навучэнцаў установы агульнай сярэдняй адукацыі. Да іх адносяцца пачатковыя, базавыя, сярэднія школы, гімназіі, ліцэі, гімназіі — каледжы мастацтваў, сувораўскае і кадэцкае вучылішчы, санаторныя школы-інтэрнаты, школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот, вучылішчы алімпійскага рэзерву. Іх агульная колькасць больш за 2800. Гімназій і ліцэяў налічваецца каля 230. Агульная колькасць навучэнцаў у краіне за апошнія гады ўзрасла амаль да 1090 тыс. чалавек.

**Установы адукацыі** →
- Дашкольнай адукацыі
- Агульнай сярэдняй адукацыі
- Прафесійна-тэхнічнай адукацыі
- Сярэдняй спецыяльнай адукацыі
- Вышэйшай адукацыі

Мал. 137. Асноўныя тыпы ўстаноў адукацыі ў Беларусі